Сямейная газета



**Рэцэпт пераадолення крызісу «сярэдняга ўзросту»**



**Калі жаночая калонія — не прысуд на ўсё жыццё**



**На дарогу выбег кот. Што рабіць кіроўцу?**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«У 2017 годзе ў складанай абстаноўцы ў выніку сумесных намаганняў мы не толькі адстаялі, але і ўмацавалі ўжо заваяваныя міжнародныя пазіцыі. За Мінскам захоўваецца статус аднаго з цэнтраў рэгіянальнай палітыкі, пляцоўкі, на якой абмяркоўваюцца рэгіянальныя і сусветныя праблемы. Зусім не дзеля лаўраў, мы прынцыпова працягнем намаганні па гарантаванні бяспекі ў рэгіёне, будзем і далей забяспечваць пляцоўку для перагавораў, прасоўваць міратворчыя ініцыятывы, удзельнічаць у фарміраванні міжнароднага парадку дня на гэтым жыццёва важным напрамку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9886 | ▼ |
| Еўра | 2,4605 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0348 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0733 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 18027>

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

8 ЛЮТАГА 2018 г. ЧАЦВЕР № 27 (28643)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Цёплы забег



**Забег у валёнках правялі 7 лютага ў Мінску. Незвычайнае спаборніцтва было прымеркавана да дабрачыннага праекта «Зімовыя бегавыя гульні». Першыя 50 удзельнікаў, якія прайшлі рэгістрацыю, бясплатна атрымалі на старце валёнкі, якія маглі пакінуць сабе пасля фінішу.**

**Сабраныя пры падтрымцы Параалімпійскага камітэта Беларусі сродкі накіруюць Маладзечанскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школе-інтэрнату для дзяцей з парушэннямі зроку і Маладзечанскай санаторнай школе-інтэрнату для дзяцей, хворых на скаліёз. Грошы плануецца выдаткаваць на пераабсталяванне стадыёна і прыцягненне дзяцей з інваліднасцю ў параалімпійскі спорт.**

**Ганна ЗАНКАВІЧ.**
**Фота аўтара.**

## УРАЧЫСТЫ МОМАНТ І ЗНАК ГАТОЎНАСЦІ

Учора адбылася цырымонія ўзняцця Дзяржаўнага сцяга Беларусі на XXIII зімовых Алімпійскіх гульнях

**Мерапрыемства ў алімпійскай вёсцы правёў яе мэр Сеун Мін Ру. У цырымоніі таксама прынялі ўдзел шэф беларускай місіі на Алімпійскіх гульнях намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Аляксандр Барауля, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў паўднёвай Карэі Андрэй Папкоў, а таксама спартсмены і трэнеры беларускай дэлегацыі.**






Адзначым, што цырымонія ўзняцця дзяржаўных сцягоў — адно з найстаражытнейшых і найважнейшых сімвалічных мерапрыемстваў на Гульнях, яна папярэднічае афіцыйнаму адкрыццю кожнай Алімпіяды і сімвалізуе гатоўнасць алімпійцаў краіны да ўдзелу ў ёй.

СТАР. 2

■ Нам засталася спадчына

## САКРЭТЫ КВЕТАК І ТРАЎ

### Лячэнне народнымі сродкамі: гаючая сіла або эфект плацэба?

**Калісьці іншых лекаў, чым народныя, не было наогул. Цяпер зусім іншая справа. У аптэцы таблеткі і мікстуры на любы густ, былі б грошы. Купіў, выпіў і забыў пра хваробу. На крайні выпадак можна набыць нешта з травяных збораў ці настоек. Іх таксама ў продажы хапае. Усе правераныя і вывучаныя. Але, кажуць знаўцы ад народа, гэта не зусім адно і тое ж, што нарыхтаваў чалавек, які ведае сакрэты прыроды. На жаль, цяпер такіх людзей становіцца ўсё менш. Вёскі паміраюць, а моладзь мала цікавіцца бабулінымі рэцэптамі. Навошта ім гэта трэба? Афіцыйна, і гэта пацвердзілі ва ўпраўленні аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама, сёння на тэрыторыі рэгіёна ніводнага траўніка няма. Але на вёсках яшчэ ведаюць, як карыстацца прыроднай аптэкай. Нашы сураэмоўнікі траўнікамі сябе не лічаць, але тое-сёе пра лекавыя расліны ведаюць. Кажуць, што яны ім ратуюць жыццё і даюць сілы.**

### СРОДАК СУПРАЦЬ АСТМЫ

У Тамары Аксёнавай з вёскі Кабіна Гара Слаўгарадскага раёна дома цэлы аптэкарскі агарод. Тут табе і жывакост, і ісоп, і медуніца, і сінюха блакітная, і эхінацэя, і шалфей з чабаром, і іншыя карысныя травы і кветкі. На момант сустрэчы пенсіянерка змагалася з наступствамі нядаўняга грыпу. Прызнаецца, што захапленне травамі добра дапамагае ёй іх аблегчыць. Піць таблеткі прыйшлося, але ў якасці дапаможнага сродку ў ход ідуць зробленыя сваімі рукамі лекі.

СТАР. 4